# А слова сталася... кнігай



Рукапісны сшытак вершаў Каруся Каганца з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Фота Кастуся Дробава.

Гэтае выказванне, знаёмае ўсім вернікам, праўда, крыху перайначанае ў гэтым загалоўку, як нельга гучней чуецца менавіта сёння. Але ўжо ў арыентацыі да справы культурнай. Тым не менш справы духоўнай па сваёй сутнасці.

Наша краіна і самая галоўная кніжніца, Нацыянальна бібліятэка Беларусі, гэтымі днямі вось ўжо 15-ы раз сустракаюць удзельнікаў Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў. Што ў праграме? Ды тут абмяркуюць мноства аспектаў: культура выданняў беларускай эміграцыі, выдавецкія школы асобных нацый, страчаныя і зноў адшуканыя зборы асобных бібліятэк.

Чаму сустрэча менавіта на Беларусі? Чаму менавіта Нацыянальная бібліятэка прымае форум? Мяркуйце самі: калі скажам банальна, краіна мае глыбокія карані станоўчага стаўлення да кнігі. Калі не банальна, то ў нас і сёння вялікія сродкі выдаткоўваюцца на падтрыманне культуры друкавання.

Каб кніга жыла. А ў кнізе — мы.